# Культурнае жыццё Салігорска

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСКА

## СУСТРЭЧА З ЛЮБІМЫМ АРТЫСТАМ

З вялікім поспехам на экранах кінатэатраў нашай краіны дэманстраваўся кінафільм «Людзі і звяры». Гледачам вельмі спадабаўся галоўны герой фільма, ролю якога ўдала выканаў народны артыст БССР Ярэменка.

І вось кінаартыст Ярэменка прыехаў у Салігорск. У шырокаэкранным кінатэатры адбылася яго цёплая сустрэча з шахцёрамі, будаўнікамі, жыхарамі маладога горада. Артыст расказаў любіцелям кіно аб тым, як працаваў над новай для яго роллю, падзяліўся планамі на будучае.